*УДК 94 (474/476) ВКЛ «1792/1793»:32(043.3)*

*В. В. АНІПЯРКОЎ*

# ПРАБЛЕМЫ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ РАСІЙСКАЙ АРМІІ НА ЗЕМЛЯХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1792–1793 гг.

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск, Беларусь,*
*e-mail:anipiarkou@tut.by*

Статья посвящена малоизученному в рамках истории Беларуси периоду – Тарговицкой конфедерации (1792–1793). На основе новых архивных документов подробно рассматриваются механизмы и экономические обстоятельства обеспечения провиантом и фуражом российской армии, союзной конфедератам. Сделан вывод о том, что местным землевладельцам снабжение российских войск приносило преимущественно не выгоды, а убытки. Следствием такой ситуации стали постоянные конфликты российских военных с представителями Тарговицкой конфедерации, а также представителей конфедерации с местной шляхтой, что дополнительно склоняло российское политическое руководство в сторону осуществления второго раздела Речи Посполитой, а часть местного населения – к восстанию против царизма.

*Ключевые слова*: второй раздел Речи Посполитой, российская армия, Тарговицкая конфедерация, конфедерационные суды, институтты региональной власти, шляхта, беглые крестьяне, продовольственный кризис, обеспечение войск, общественные конфликты.

*V. V. ANIPIARKOU*

## PROVISIONAL PROBLEMS OF THE RUSSIAN ARMY ON LANDS OF THE CENTRAL AND EASTERN BELARUS DURING THE 1792–1793 YEARS

*Belarusian State Medical University, Minsk, Belarus, e-mail:anipiarkou@tut.by*

Article contains a description of the poorly studied period in the history of Belarus, namely, the period of the Targowica confederation (1792–1793). This association of gentry (szlachta) was created with help of the Russian army to strengthen the political influence of the Russian Empire on lands of the Polish–Lithuanian Commonwealth (Rzeczpospolita). The confederates played role of mediators in relations between the local people and military departments of the Russian Empire placed on the territory of the nearby state. In particular, they were responsible for the collection of food and fodder for the “union army” of the Russian Empire. Relationships on this matter between confederates, Russian army and local people were highly conflictive. All results of researches have been based on archival sources, most of them are manuscripts.

*Keywords:* Second Partition of the Polish-Lithuanian Commonwealth, Russian army, Targowica confederation, courts of confederations, institutes of regional authorities, gentry, fugitive peasants, food crisis, support of the army, social conflicts.

18 мая 1792 г. без абвяшчэння афіцыйнай вайны на тэрыторыю Рэчы Паспалітай былі ўведзены войскі Расійскай імперыі. Ваенная інтэрвенцыя, распачатая па загадзе Кацярыны II, не толькі спыніла ў Рэчы Паспалітай дзеянне рэформ Чатырохгадовага (1788–1792) сойма, але і ўсклала на плечы мясцовага насельніцтва абавязак забеспячэння правіянтам і фуражом шматлікіх расійскіх вайскоўцаў, агульная колькасць якіх толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім перавышала 40 тысяч чалавек (табл. 1).

У рамках дадзенага артыкула разглядаюцца механізмы і эканамічныя абставіны забеспячэння расійскай арміі на беларускіх землях Рэчы Паспалітай у названы перыяд. Нягледзячы на тое, што шэраг даследчыкаў ужо звярталіся да гэтага пытання, яго адлюстраванне ў айчыннай гістарыяграфіі цяжка прызнаць здавальняючым. Высновы, зробленыя даследчыкамі, носяць хутчэй

© Аніпяркоў В. В., 2015

супярэчлівы характар і засноўваюцца на досыць абмежаваным коле гістарычных крыніц [1; 3; 4]. Істотна пашырыць яго дазваляе ўвядзенне ў навуковы абарот дакументаў з фондаў судоў Таргавіцкай канфедэрацыі. Як вядома, гэтая канфедэрацыя была створана ў Пецярбургу з мэтай абгрунтавання расійскай ваеннай інтэрвенцыі на землях Рэчы Паспалітай, а яе цэнтральным і рэгіянальным (у ваяводствах і паветах) структурам па ўказанні Кацярыны II былі перададзены паўнамоцтвы дзяржаўнай улады і роля пасрэдніцкіх інстытутаў у зносінах мясцовага насельніцтва з расійскімі ваеннымі аддзеламі. У сваёй дакументацыі, значная частка якой знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, таргавічане мелі звычай падрабязна фіксаваць прычыны, акалічнасці і вынікі зносін з расійскімі войскамі.

Т а б л і ц а 1. **Колькасны склад расійскай арміі ў ВКЛ па стане на 12 студзеня 1793 г. (старога стылю)**

| Паказчык | Колькасць па спісе | З агульнай колькасці | | | | | дадаткова патрабуецца | звыш камплекту | коняў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | наяўных у палках | | у адлучцы | | у шпіталях | | | |
| | | здаровых | хворых | далёкай | блізкай | | | | |
| Конніца | 11025 | 9226 | 228 | 833 | 629 | 109 | 1004 | 546 | 13359 |
| Пяхота | 29108 | 25882 | 650 | 1122 | 850 | 604 | 2556 | 548 | 2776 |
| Артылерыя | 1839 | 1726 | 30 | 79 | 4 | – | 66 | 19 | 1373 |
| Разам | 41972 | 36834 | 908 | 2034 | 1483 | 713 | 3626 | 1113 | 17508 |

К р ы н і ц а: РГАДА. – Ф. 12. Оп. 1. Ед. хр. 217. Л. 6.

Да моманту ўзнікнення ў ваяводствах і паветах органаў улады Таргавіцкай канфедэрацыі фураж і правіянт браўся ў мясцовых жыхароў адвольна па распараджэнні расійскіх афіцэраў [5, л. 96–99]. Гэты працэс суправаджаўся значнымі злоўжываннямі. У рапарце ад 5 ліпеня 1792 г. генерал-паручнік Іван Ферзен прызнаваўся генерал-аншэфу расійскіх войскаў у Вялікім Княстве Літоўскім Міхаілу Крачэтнікаву: «Я столькі задаволены храбрасцю войскаў, мне даручаных, колькі скарджуся Вам на іх беспарадкі, бо яны, адступаючы ад паслухмянасці, робяць крадзяжы і іншыя рабаванні» [14, л. 5]. «На забеспячэнне <…> некаторых уладанняў за спазнанае імі разрабаванне» М. М. Крачэтнікавым выдаткоўваліся адмысловыя сумы [14, л. 3, 24 адв., 36–37]. У шматлікіх скаргах да кіраўніцтва Таргавіцкай канфедэрацыі землеўласнікі згадвалі пра грошы, неабгрунтавана запатрабаваныя расійскімі афіцэрамі, нявернутых коней, спаленні ў вёсках, беспрычынныя арышты і біццё з боку салдат, ужыванне тымі без аплаты гарэлкі, ежы, адзення, адабранага ў сялян, прымусовае ўтрыманне пошт без кампенсацыі, забранне вайскоўцамі Расійскай імперыі фуражу і правіянту з вайсковых магазінаў Вялікага Княства Літоўскага [6, л. 588, 605, 613–618, 624, 627, 636–639, 643, 646, 660–663, 671, 674, 676, 677, 680–683, 689, 690–693, 695, 705, 721, 723, 730, 756, 1029 адв. – 1030].

Стварэнне структур канфедэрацыі ў ваяводствах і паветах прадугледжвала наданне працэсу паставак пэўнага ўпарадкавання і рэгламентавалася наступнай схемай. Кіраўнікі вайсковых падраздзяленняў накіроўвалі інфармацыю аб сваіх патрэбах у правіянце і фуражы ў Галоўную правіянцкую камісію расійскіх войскаў у Варшаве. Тая звярталася да Генеральнай канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага, ад якой рэгіянальным канфедэрацыям паступаў загад аб забеспячэнні палкоў на сваёй тэрыторыі [7, л. 160]. Колькасць прадукцыі, прызначанай на павет, мясцовая канфедэрацыя павінна была размеркаваць раўнамерна паміж сялянскімі «дымамі» [8, л. 3 адв. – 4, 14 адв., 47–49 адв.]. За здачу прадукцыі з свайго ўладання перад канфедэрацыяй адказваў памешчык; перад расійскімі войскамі адказнай за арганізацыю паставак з павета была мясцовая канфедэрацыя.

Такая схема зрабіла канфедэрацыі аб’ектам прэтэнзій з боку расійскіх войскаў, а таксама аб’ектам агульнай незадаволенасці шляхты ўскладзеным на яе абавязкам. Дакументы сведчаць, што ў сувязі са збіраннем у насельніцтва правіянту і фуражу пагаршаліся адносіны як расійскіх каманд з канфедэрацыямі, так і канфедэрацый з мясцовай шляхтай. Каталізатарамі ў гэтым працэсе выступалі недахоп прадуктаў харчавання, выкліканы летне-восеньскім неўраджаем 1792 г.,

нізкія закупачныя кошты, прапанаваныя расійскім кіраўніцтвам, карупцыя ў вайсковым і таргавіцкім асяродку.

Найбольш адкрыта факты карупцыі праявіліся ў Ваўкавыскім і Лідскім паветах. Пісар Ваўкавыскай канфедэрацыі Ян Контрым пісьмова засведчыў, што маршалак Францыск Кулеша з прыхільнымі яму консуламі Антоніям Міцутам і Янам Гаснеўскім «без аніякага парадку самаўпраўна накідваў фуражы на тыя дамы, якія помсце сваёй з-за даўніх сутычак жадаў мецць падлеглымі, а вызваліў тыя, якім пастанавіў сведчыць прыватныя ласкі», ён жа быў абвінавачаны пісарам у фабрыкацыі дакументаў, калі з аналагічнай мэтай уносіў праўкі ў тэксты прынятых ужо на консульскім сходзе рэзалюцый» [5, л. 102–103 адв.]. Наяўнасць парушэнняў была афіцыйна прызнана Генеральнай канфедэрацыяй Вялікага Княства Літоўскага. У яе рэзалюцыі ад 26 лютага 1793 г. адзначалася, што «мясцовая канфедэрацыя Ваўкавыскага павета насуперак выразнага распараджэння і нашага раскладу <…> адважылася па-свойму размяркоўваць фураж і правіянт для расійскага войску і, вызваляючы прыязных сабе, дымы іншых абывацеляў цяжкім накідваннем праследавала і праследуе» [5, л. 239–239 адв.]. У Лідзе ў маі 1793 г. дайшло да адстаўкі чатырох консулаў мясцовай канфедэрацыі [6, л. 850]. Замена яе складу выклікала рэгістрацыю ў канцылярскіх кнігах маніфестаў з аповедам шляхты пра крыўды, зведаныя ад папярэдніх консулаў. Іх, сярод іншага, абвінавачвалі ў наўмысным скажэнні інфармацыі аб здадзеным правіянце і фуражы, што дазваляла скіроўваць расійскія атрады дзеля здзяйснення прымусовых рэквізіцый ва ўладанні шляхціцаў, якія выканалі свае абавязкі ў дачыненні паставак, але былі аб'ектам прыватнай непрыязнасці кагосьці з канфедэратаў [6, л. 859]. У маніфесце Вінцэнта Янчоўскага, канюшага Лідскага павета, распавядаецца таксама, што канфедэрацыя, «з папярэдніх асоб складзеная», спагнаўшы са шляхты дастатковую для забеспячэння расійскіх войскаў колькасць прадукцыі, яе своечасова не даставіла, чым стварыла нагоду, каб расійскія атрады, прысланыя з Ліды, са зброяй і барабанамі гвалтоўна забіралі ў жыхароў правіянт і фураж, робячы ім разнастайныя крыўды. Каб справа не дайшла да суда ў Вільні з удзелам расійскага вайсковага кіраўніцтва Ігельстрома, канфедэрацыя засведчыла, што «атрады Казлоўскага палка, які ў Лідзе стаіць, вельмі спакойна трымалі сябе і абывацелі ніводнай скаргі не прынеслі» [6, л. 858–858 адв.].

Правіянт і фураж ад насельніцтва расійскія войскі прымалі ў месцах, вызначаных імі для «магазінаў». У кожным з іх знаходзіўся дэлегат рэгіянальнай канфедэрацыі, якога называлі «правіянтавы камісар». Ён павінен быў абараняць шляхту, не дапускаючы абмераў і іншых злоўжыванняў расійскіх салдат пры прыняцці прадукцыі. Такім жа чынам ад кожнага аддзела расійскіх войскаў прызначаўся афіцэр, з якім дэлегат канфедэрацыі павінен быў звязвацца дзеля вырашэння канфліктных сітуацый, сумеснага разгляду скаргаў і просьбаў [7, л. 161–162]. Вынікі дзейнасці правіянцкіх камісараў не з'яўляліся спрыяльнымі для адносін канфедэрацый і шляхты. Скаргі, скіраваныя шляхтай у канцылярыі канфедэрацый, сведчаць пра дастаткова шматлікія парушэнні, якія практыкаваліся расійскімі вайскоўцамі пры прыняцці прадукцыі. Лідскі падкаморы Тадэвуш Нарбут у мемарыяле да мясцовай канфедэрацыі ад 6 верасня 1792 г. скардзіўся «не толькі на гвалтоўнае абыходжанне расійскага войску, але таксама на *В. ЯП.* дэпутаванага камісара за нерэгулярнасць увагі ў прыманні і пільнаванні аддаванага фуражу» [6, л. 651–651 адв]. У шматлікіх маніфестах мясцовыя землеўласнікі, у т. л. са складу канфедэратаў, апісвалі самыя розныя незаконныя дзеянні з боку афіцэраў і салдат Расійскай імперыі. Найбольшыя магчымасці для злоўжыванняў шараговыя вайскоўцы расійскай арміі атрымоўвалі пры размяшчэнні па сялянскіх хатах, калі выходзілі з поля зроку камандзіраў. На думку канфедэратаў, размяшчэнне вайскоўцаў па вёсках было вынікам карупцыі ўнутры расійскага афіцэрскага корпуса. Напрыклад, у снежні 1792 г. Мінская канфедэрацыя адзначала, што салдаты Нарвскага палка харчуюцца ў сялян, без усялякай кампенсацыі гаспадарам, пры тым, «што магазіны не ёсць без правізіі і што, хаця паўсюдна вялікае бездарожжа, з самых адлеглых парафій штодня падвозяцца магазіны і фуражы» [8, л. 5 адв.]. Кіраўніцтва Таргавіцкай канфедэрацыі ў лістападзе 1792 г. паведамляла аб атрыманых звестках, што правіянт і фураж, «які патрабуецца [ад насельніцтва] нібыта для забеспячэння расійскага войску», пасля перапрадаецца, а некаторыя з расійскіх афіцэраў бяруць «замест правіянту самавольна запатрабаваныя грошы, коштам, безапеляцыйна праз сябе складзеным» [16, с. 836]. Звесткі пра грашовыя кантрыбуцыі пацвярджае інфармацыя, змешчаная ў кнігах

рэгіянальных канфедэрацый. Напрыклад, у Рэчыцкім павеце па дакументах канфедэрацыі толькі маёр Берцаў атрымаў 5 тыс. руб. за недаздадзены шляхтай правіянт і фураж [9, л. 155 адв.].

Мясцовая шляхта таксама была незадаволена памерам кампенсацыі, якую прапаноўвала расійскае кіраўніцтва за здадзеную прадукцыю. Войскі Расійскай імперыі ў дакументах як імператарскага двара, так і таргавічан былі пазначаны дадаткам «сяброўскія» [2, с. 284]. У рэскрыпце, які папярэднічаў уваходу войскаў, Кацярына ІІ загадала М. М. Крачэтнікаву плаціць за правіянт і фураж «па памяркоўных коштах», што загадзя выключала выкарыстанне рыначных механізмаў у разліках вайскоўцаў Расійскай імперыі з мясцовымі землеўласнікамі [2, с. 351]. У адпаведнасці з патрабаваннямі імператрыцы, Шыман Касакоўскі, кіраўнік канфедэратаў у Вялікім Княстве Літоўскім, падкрэсліваў, інструктуючы таргавіцкіх ураднікаў, што «консул [мясцовай канфедэрацыі] зробіць разам з абывацелямі ваяводства або павета памяркоўны кошт мукі і круп і астатняга правіянту і фуражу насуперак цяперашняга нашага края кошту, каб падвышэннем яго не паказалі мы сябе няўдзячнымі ліхвярамі» [2, с. 337]. Забеспячэнне вайсковых магазінаў па такіх коштах было для шляхты эканамічна невыгодным, з гэтай прычыны ўтрыманне расійскага войску мела рысы абавязковай павіннасці.

Сельскагаспадарчую прадукцыю шляхта здавала на падставе «білетаў», выпісаных рэгіянальнай канфедэрацыяй. Без «білетаў» патрабаваць прадукцыю ў насельніцтва расійскія войскі не мелі права. Спрабуючы дамагчыся дакладнага выканання гэтага правіла вайсковымі камандамі, мясцовыя канфедэрацыі неаднаразова складалі скаргі цэнтральнаму кіраўніцтву. Іх наяўнасць адлюстроўвала адносную слабасць канфедэрацый. Напрыклад, у снежні 1792 г. консул Мінскай канфедэрацыі Станіслаў Івашкевіч ездзіў у Іллю, пасля таго як салдаты Нарвскага палка без санкцыі канфедэрацыі, пад пагрозай зброі, забралі з мясцовага графства фураж, звязаўшы адміністратара ўладанняў Яна Макавецкага [8, л. 8 адв. – 9]. Па загадзе расійскага палкоўніка Мілера рэквізіцыі, не пацверджаныя дакументамі канфедэрацыі, адначасова былі праведзены ў шэрагу іншых уладанняў Мінскага ваяводства. Такія дзеянні былі адказам на пазіцыю рэгіянальных канфедэрацый, якія самі або праз заявы жыхароў паветаў адкрыта абвясцілі пра немагчымасць выканання паставак у запатрабаваных памерах. Па інфармацыі расійскага войсковага кіраўніцтва, адмову ад паставак, прызначаных на студзень і люты 1793 г., склалі ўсе канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага, за выключэннем Брэсцкай [11, л. 64–64 адв]. Адно з першых такіх сведчанняў сустракаецца ў дакументах Случарэцкага канфедэрацкага суда. У актавай кнізе ад 12 снежня 1792 г. запісана, што шляхціцы павета, «даведаўшыся аб рэквізіцыі ад генерал-аншэфа Кахоўскага ад 16 кастрычніка 1792 г. адносна далейшай дастаўкі фуражоў расійскаму войску, раскладзенай на дымы абывацеляў, і ад мясцовай канфедэрацыі на збор абывацеляў у Слуцку 8 снежня ў мэтах яе найдакладнага выканання, сабраўшыся і параіўшыся, засталіся перакананымі, што ніякім спосабам забяспечыць далейшую дастаўку фуражоў і правіянтаў не ў стане, па-першае, з-за паўсюднага ў нашым краі неўраджаю, па-другое, з-за частых у цяперашні час маршаў і контрмаршаў, ажыццёўленых расійскім войскам праз нашы парафіі» [10, л. 110–114]. Дакумент змяшчаў таксама пералік прэтэнзій да расійскай арміі, якія ад імя павета павінны былі пераказаць выбарныя дэлегаты да Генеральнай канфедэрацыі.

Адмову ад далейшага забеспячэння расійскіх войскаў мясцовыя канфедэрацыі тлумачылі эканамічным заняпадам падуладных ім тэрыторый. Напярэдадні інтэрвенцыі старшыня Ваеннай калегіі Расіі Мікалай Салтыкоў падкрэсліваў адсутнасць патрэбы расійскім войскам «мець лішні запас <...>, зважаючы на вельмі вялікі ў тым краі дастатак хлеба» [13, л. 42]. Такія дапушчэнні не адлюстравалі праўдзівы стан рэчаў. У лютым 1793 г. Мінская канфедэрацыя пісала ў адказ на патрабаванні Нарвскага і Ізюмскага палкоў: «З’яўляюцца сведкамі іхмосці афіцэры тых самых палкоў, якая пануе галеча і роспач няшчасных жыхароў, коні і валы падаюць па дарозе. А мноства абывацеляў штодзённа прыбываюць да канфедэрацыі са сведчаннем, што не маюць спосабу аддаць вызначаных наперад магазінаў на тыя два месяцы. Слёзы іх і енкі ёсць довадам гэтай праўды. Паўсюдна гэтае ваяводства было і ёсць падлеглае ўсім загадам, якія даходзілі ад расійскіх каманд <…> Але калі апошняя прыціснула галеча, жыхары не толькі хлеба, сена, але і нават корму для сваіх жывёл не маюць, а двары, аддаючы на працягу некалькіх месяцаў за сваё падданства фуражы і правіянты, апарожненыя дашчэнту з запасаў» [8, л. 79]. Па

назіраннях расійскіх вайскоўцаў, неўраджай 1792 г. даволі слаба закрануў Украіну і Берасцейшчыну, тады як яго эпіцэнтр прыпаў на ўсходнія паветы Вялікага Княства Літоўскага [11, л. 64, 117]. У лістападзе 1792 г. адзін з таемных інфарматараў дакладаў Ігнацыю Патоцкаму: «З Белай Русі абывацелі да Найяснейшай Генеральнай канфедэрацыі пісалі пра найвялікшы голад і каб тая ж Генеральная канфедэрацыя праз літасць ратавала людзей, якія з голаду гінуць» [17, с. 89].

У такой сітуацыі кіраўнікі Таргавіцкай канфедэрацыі спрабавалі наблізіцца да рынačных коштаў, баючыся ў адваротным выпадку быць дыскрэдытаванымі ў вачах шляхты [2, с. 468]. Кошты, прадстаўленыя дэлегатамі канфедэрацыі, якія прыехалі ў Пецярбург у снежні 1792 г., Кацярына II палічыла «несуразмерна высокімі» [15, л. 9–9 адв.]. Оттану Ігельстрому, які выязджаў праз Гродна ў Варшаву, каб змяніць М. М. Крачэтнікава, было даручана дамагчыся іх змяншэння. Праязджаючы ў студзені 1793 г. праз беларускія землі, О. А. Ігельстром пакінуў справаздачы аб убачаным. У лісце фаварыту імператрыцы Платону Зубаву новы кіраўнік расійскіх войскаў адзначаў: «Ніяк не стамляюся дзівіцца, што забеспячэнне нашых войскаў правіянтам, а асабліва фуражом, у поўным разладзе, і такім, што амаль паўсюдна не больш як на двое сутак яго пры палках дастае, а ёсць і такія аддзяленні, якія павінны запазычваць сабе харчаванне, а перадусім коням пракармленне ад жыхароў без асігнацыі Генеральнай канфедэрацыі, задавольваючы іх квітанцыямі. У іншых месцах, кажуць, выдзелены грошы з тым, каб войскі самі дастаўлялі сабе правіянт і фураж, прымушаючы жыхароў прымаць за тое грошы па такіх коштах, якія ад каманднага генерала вызначаны. Разнастайнае войску забеспячэнне безумоўна зробіць незадавальненне ў войску, у жыхарах і ў самой Генеральнай канфедэрацыі» [11, л. 10–10 адв.]. О. А. Ігельстром паведаміў Кацярыне II, што, сустрэўшыся з ім, прадстаўнікі Таргавіцкай канфедэрацыі патрабавалі распачаць выплату грошай за атрыманую прадукцыю, а ад перагавораў па пытанні змяншэння коштаў ухіліліся. У адказ Кацярына II вызначыла кошты на правіянт і фураж сваёй рукой (табл. 2). Генеральнай канфедэрацыі была накіравана нота, дзе О. А. Ігельстром падаў прызначаныя імператрыцай кошты, пазначыўшы, «што гэткае прызначэнне ёсць фінальнае» [11, л. 80].

Т а б л і ц а 2. **Тарыфы разлікаў расійскага войску з прадстаўнікамі паветаў ВКЛ у маі 1792 г. – верасні 1793 г.**

| Правіянт і фураж | Тарыфы на правіянт і фураж, атрыманыя за перыяд: | | | Рынкачныя кошты ў студзені 1793 г. |
|---|---|---|---|---|
| | з мая па жнівень 1792 г. | з верасня па снежань 1792 г. | са студзеня па верасень 1793 г. | |
| Мука, чвэрць | 1,20 руб. | 2 руб. | 2,50 руб. | 3 – 3,50 руб. |
| Крупа, чвэрць | 1,50 руб. | 4 руб. | 5 руб. | 4,50 – 6 руб. |
| Авёс, чвэрць | 0,75 руб. | 1,30 руб. | 1,80 руб. | 2 – 2,33 руб. |
| Сена, пуд | – | 0,10 руб. | 0,18 руб. | 0,22 – 0,33 руб. |

К р ы н і ц а: РГВИА. – Ф. 41. Оп. 1/199. Ед. хр. 204. Л. 117.

Адначасова расійскаму войску была разаслана інструкцыя, якая патрабавала не дапускаць набыцця правіянту і фуражу за наяўныя грошы. Дакументацыя расійскіх палкоў, размешчаных у Беларусі, паказвае, што іх камандзіры пачыналі практыкаваць самастойнае набыццё прадукцыі, выдаткоўваючы на гэта грошы з палкавых сум, пасля чаго беспасяхова патрабавалі кампенсаваць выдаткі палкоў з агульнай касы расійскага войску [12, л. 206]. У лістах П. А. Зубаву О. А. Ігельстром скардзіўся на абмежаваны памер сродкаў у касе, засведчыўшы няздольнасць расійскага войску разлічыцца за атрыманую сельскагаспадарчую прадукцыю [11, л. 26 адв., 124–124 адв.]. У сакавіку 1793 г. разглядаўся нават варыянт спісання ўсіх пазык расійскіх войскаў на ўрад Рэчы Паспалітай, што, па ўласным прызнанні О. А. Ігельстрома, пазбавіла б насельніцтва любых грошай за пастаўлены правіянт і фураж [11, л. 159 адв].

Напрыканцы студзеня 1793 г. у расійскія войскі паступіў загад О. А. Ігельстрома «накіроўваць немалыя каманды для прымусу ў тыя вёскі, з якіх не дастаўляюць прызначанай колькасці правіянту і фуражу па білетах Генеральнай і ваяводскіх канфедэрацый». Салдаты з такіх атрадаў павіны былі жыць на забеспячэнні памешчыка. Калі той, нават ва ўмовах экзекуцыі, будзе адмаў-

ляцца выдаваць правіянт і фураж, належала ў яго ўладаннях правесці вобыск, забіраючы з выпіскай квітанцыі тую колькасць прадукцыі, якая пазначана ў білетах канфедэрацыі, «пры гэтым робячы вопіс, колькі па прыблізнай ацэнцы застаецца яшчэ ў памешчыка» [11, л. 65–65 адв.]. На выпадак, калі канфедэрацыі адмовіліся б выпісваць білеты, брыгадным генералам загадзя даваўся дазвол накіроўваць каманды ў любыя ўладанні паводле ўласнага меркавання генералаў [11, л. 65 адв. – 66]. Дакументы канфедэрацый змрочнымі фарбамі адлюстравалі далейшую карціну зносін з расійскім войскам. З расійскіх палкоў у канцылярыі канфедэрацый накіроўваліся афіцэры. Прыкрываючыся атрыманым загадам, яны патрабавалі выдаць ім на рукі білеты на правіянт і фураж, а ў адваротным выпадку пагражалі неадкладна распачаць хаатычныя рэквізіцыі. Маючы білеты, расійскія каманды адбіралі ва ўладаннях недаздадзеную прадукцыю, правакуючы варожасць шляхты не толькі да расійскага войска, але і да канфедэрацый, бо менавіта іх дакументамі расійскія салдаты абгрунтоўвалі свае дзеянні. Адказваючы на абвінавачванні з боку шляхты, Мінская канфедэрацыя ў студзені 1793 г. наступным чынам тлумачыла свае дзеянні: «Экспедыцыі *ЯВ.* генерал-лейтэнанта графа Меліна пагражалі, што калі канфедэрацыя замарудзіць выданне білетаў на гэты двухмесячны магазін, то палкі маюць дазвол забіраць збожжа і фураж, якія ім падабаюцца; канфедэрацыя для прадухілення такога жахлівага няшчасця працавала на працягу некалькіх дзён і начэй, каб паскорыць выпіску згаданых білетаў, а грубіянства афіцэра (які з судовай залы не жадаў выходзіць, пакуль білеты не будуць аддадзены) даводзіла, што шукана зачэпкі, каб праз спазненне канфедэрацыі нагода была для выканання спраектаваных уціскаў <…> Можаш сумленна, грамадзянін, <…> не вызнаць найчулага клопату мясцовай канфедэрацыі аб дабры ваяводства <…>, але ў гэты жахлівы час, калі стаім ужо над прорвай, зайздрасць ёсць доляй, якая спадарожнічае кожным, нават самым чыстым ўчынкам. Канфедэрацыя Мінскага ваяводства, верная ў выкананні сваіх абавязкаў і заўсёды клапатлівая аб засланенні ваяводства ад апошняй руіны ў гэтыя жахлівыя моманты <…>, штодзённа ўзносіць малітвы аб набліжэнні часу, у якім складзе свае справы, бо тыя робяцца нязносным ярмом, крыніцаю горычы, да таго ж коштам здароўя і гаспадаркі» [8, л. 84–86].

Павіннасці адносна забеспячэння сваёй арміі расійскае камандаванне падпарадкавала прынцыпу колавай парукі. Квітанцыі і грошы па іх павет мог атрымаць толькі пасля таго, як апошняя шляхецкая гаспадарка здасць прызначаны правіянт і фураж. З гэтай прычыны Рэчыцкая канфедэрацыя ў студзені 1793 г. згадвала пра «некалькіх упартых абываццеляў», з-за якіх яна «шкадаваць мусіць, што квітанцыі на правіянт і фураж, які быў выдадзены і выдаецца, атрымаць не можа» [9, л. 161 адв.]. Пры гэтым рэгулярныя выплаты за правіянт і фураж паветам распачаліся толькі з мая 1793 г. Па словах О. А. Ігельстрома, грошы былі аддадзены для таго, каб «прылашчыць насельніцтва» напярэдадні выбараў у сойм, скліканне якога абумовіла рашэнне аб другім падзеле Рэчы Паспалітай [11, л. 228]. На гэтай падставе Я. К. Анішчанка піша пра «меркантыльны хаўрус паміж пераможцамі і ахвярамі акупацыі», які датрываў да Гарадзенскага сойма 1793 г., рашэнні якога «былі, так бы мовіць, куплены за выгадныя харчовыя нарыхтоўкі ў расійскія войскі» [1, с. 371]. На наш погляд, гэты тэзіс патрабуе істотнай карэкціроўкі.

Дакументы сведчаць, што забеспячэнне расійскіх войск на беларускіх землях несла землеўласнікам пераважна не выгоды, а страты, праходзіла на фоне вострых эканамічных праблем, у тым ліку масавага голаду і бегства сялян, а таксама відавочнага палітычнага незадавальнення ў асяродку шляхты, выкліканага расійскай інтэрвенцыяй і спыненнем рэформ Чатырохгадовага сойма. Наступствамі такой сітуацыі сталі пастаянныя канфлікты як расійскіх каманд з прадстаўнікамі Таргавіцкай канфедэрацыі, так і канфедэрацыі са шляхтай, што дадаткова схіляла Кацярыну ІІ у бок ажыццяўлення другога падзелу Рэчы Паспалітай, а частку мясцовага грамадства – да паўстання супраць царызму.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Анішчанка, Я. К.* Ваеннае забеспячэнне Расіяй другога падзелу Рэчы Паспалітай / Я. К. Анішчанка // Беларускі гістарычны агляд. – 2008. – Т. 15, № 1/2. – С. 365–374.

2. Дела Польши 1792 года. (Из бумаг М. В. Каховского, М. Н. Кречетникова и других) // Сборник Русского Императорского Исторического общества / под наблюдением Н. Ф. Дубровина. – СПб., 1887. – Т. 47. – С. 240–483.

3. *Емяльянчык, У.* Паланез для касінераў: (З падзей паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі ) / У. Емяльянчык. – Мінск: Беларусь, 1994. – 160 с.
4. *Никитин, М. Г.* К вопросу о добровольном присоединении белорусской шляхты к Тарговицкой конфедерации / М. Г. Никитин // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3: Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1995. – № 1. – С. 15–19.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1899. Воп. 1. Спр. 1.
6. НГАБ. – Ф. 1900. Воп. 1. Спр. 1.
7. НГАБ. – Ф. 1901. Воп. 1. Спр. 1.
8. НГАБ. – Ф. 1901. Воп. 1. Спр. 4.
9. НГАБ. – Ф. 1903. Воп. 1. Спр. 1.
10. НГАБ. – Ф. 1934. Воп. 1. Спр. 1.
11. Российский государственный архив древних актов (РГАДА). – Ф. 12. Оп. 1. Д. 217.
12. РГАДА. – Ф. 20. Оп. 1. Д. 331.
13. Российский государственный военно–исторический архив (РГВИА). – Ф. 41. Оп. 1/199. Д. 161.
14. РГВИА. – Ф. 41. Оп. 1/199. Д. 173.
15. РГВИА. – Ф. 846. Оп. 16. Д. 2727.
16. Instrukcja UUr: Janowi Zagurskiemu Podczaszemu Włodzimirskiemu Koronney, i Mateuszowi Zyniewowi Staroscie Berezn: W. X. Lit: Gener: Konfed: konsyliarzom, do JW. Kochowskiego Generala en Cheff Woysk Nayiaś: Imperatowej Jmsci całej Rossyi celem ułożenia się o sposob dostarczania prowiantów dla tychże Woysk Rossyjskich Delegowanym od Konfed: Gener: O. N. na sessyi Extraordynaryiney w Grodnie dnia 4 novembris 1792. Roku dana // Korrespondent Warszawski. – 1792. – № 86, 17 listopada; № 87, 20 listopada. – S. 823–824, 829, 835–837.
17. Tajna korespondencja z Warszawy 1792–1794 do Ignacego Potockiego. Jan Dembowski i inni. / Opracowali Maria Rymzyna i Andrzej Zahorski. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1961. – 375 s.

*Паступіў у рэдакцыю 13.01.2015*